БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

На правах рукапісу

УДК 947.608.42(043)

**КУНІЦКАЯ ЗОЯ АЛЯКСАНДРАЎНА**

# Абласны выканаўчы камітэт Заходняй вобласці: стварэнне, структура, дзейнасць

07.00.02. – айчынная гісторыя

Дысертацыя на суісканне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук

Навуковы кіраўнік
доктар гістарычных навук,
прафесар **Коршук У.К.**

Мінск, 2006

# ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ....3
АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ....7
1. ГІСТАРЫЯГРАФІЯ І КРЫНІЦЫ....10
2. МІНСКІ ПЕРЫЯД....22
2.1. Утварэнне цэнтральнага апарату ўлады на тэрыторыі Заходняй вобласці і фронту ў лістападзе 1917 г....22
2.2. Прынцыпы арганізацыі Аблвыкамзаха: структурныя часткі, іх кампетэнцыя і ўзаемаадносіны....31
2.3. Дзейнасць бальшавікоў у Аблвыкамзаху па замацаванню перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі....39
2.4. Нацыянальнае пытанне і нацыянальныя вайсковыя фарміраванні ў практычнай дзейнасці Аблвыкамзаха....49
3. СМАЛЕНСКІ ПЕРЫЯД....59
3.1. Стварэнне і прынцыпы арганізацыі....59
3.2. Адміністрацыйнае, сацыяльна-эканамічнае і культурнае кіраўніцтва вобласцю....69
3.3. Дзейнасць Аблвыкамзаха па правядзенню палітыкі цэнтралізацыі ў межах Заходняй вобласці....80
3.4. Аблвыкамзах і беларускае нацыянальнае пытанне....90
ЗАКЛЮЧЭННЕ....99
СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ....101

# УВОДЗІНЫ

Гісторыя ведае моманты, адметныя сваёй значнасцю і важнасцю, якія ў планетарным маштабе ўплываюць на развіццё гістарычнага ходу падзей, якія ставяць перад чалавецтвам новыя мэты і ідэалы, якія нараджаюць новыя каштоўнасці і светапоглядныя арыенціры. Зараджэнне хрысціянства, падзенне Рымскай імперыі, адкрыццё Амерыкі далі імпульс развіццю новай эпохі. XX стагоддзе, багатае на разнастайныя грамадскія з'явы, у чарговы раз нарадзіла спробу рэалізаваць ідэі сацыяльнай справядлівасці. Без сумненняў, Кастрычніцкая рэвалюцыя, па сваіх маштабах, наступствах і выніках, уплыву на працэсы ў іншых краінах, можа быць залічана ў шэрагі эпахальных падзей. Грандыёзны эксперымент, пастаўлены на 1/6 частцы сушы не ўвянчаўся поспехам, і многія палітыкі, палітолагі, гісторыкі, ужо незалежных суверэнных рэспублік, успамінаючы ўзаемныя крыўды, заўчасна пасяшаліся зганьбіць і прынізіць усё звязанае з савецкім мінулым. Цяпер, калі час засланіў і аддаліў ад нас тыя падзеі, калі "выкрыццё" бальшавізму перастае быць палітычнай модай, з'яўляецца рэальная магчымасць цвяроза і без залішніх эмоцый асэнсаваць, ацаніць і атрымаць урокі гэтага гістарычнага перыяду, што патрабуе грунтоўных навуковых даследаванняў у галіне як гісторыі, так і культуры, права, эканомікі і нават псіхалогіі.

Зварот да тэматык, звязаных з перыядам Кастрычніцкай рэвалюцыі, мае асаблівае значэнне для суверэннай Рэспублікі Беларусь, вытокі якой у вачах многіх яе грамадзян зыходзяць з Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь. Пакідаючы ў баку дыскусію аб каранях нашай дзяржаўнасці, бо аўтарам дысертацыйнай працы не ставілася задача яе вырашэння, можна ўпэўнена сцвярджаць, што незалежна ад таго, дзе бачыць гэтыя карані (ці ў ССРБ ці ў сярэднявечных княствах): толькі рэвалюцыйны злом 1917 г. даў магчымасць беларусам заняць сваё месца сярод еўрапейскіх народаў.

Напярэдадні Кастрычніцкай рэвалюцыі Расія знаходзілася ў стане вайны з Германіяй і яе саюзнікамі. Баявыя дзеянні вяліся на яе тэрыторыі. У кастрычніку 1915 г. фронт стабілізаваўся на лініі Дзвінск – Паставы – Баранавічы – Пінск. Каля паловы тэрыторыі Беларусі апынулася пад нямецкай акупацыяй, у тым ліку населеныя пункты Баранавічы, Брэст, Гродна, Кобрын, Пінск і інш. [26, с. 3]. 12 (25) жніўня 1915 г. быў утвораны Заходні фронт – аператыўна-стратэгічнае аб'яднанне са штабам у Мінску. Фронт размяшчаўся на Маскоўскім стратэгічным напрамку працягласцю каля 500 км. ад мястэчка Відзы да р. Прыпяць. Заходні фронт разам з тылам займаў усходнія раёны Беларусі, частку Літвы, Смаленскую, Калужскую, частку Чарнігаўскай губерні. Напярэдадні Кастрычніцкай рэвалюцыі на Заходнім фронце дыслацыраваліся II, III і X расійскія арміі [193, с. 419]. Становішча фронту было катастрафічным. Паводле характарыстыкі начальніка штаба, баявых дзеянняў не вялося, пастаўкі харчавання і фуражу спыніліся, часці стаялі на даручаных ім участках. Стомленыя, чакаўшыя хуткага завяршэння вайны, яны патрабавалі замены. У

пачатку снежня пачалася фактычная дэмабілізацыя. Многія салдаты з прычыны голаду самавольна пакідалі пазіцыі [58, с. 125].

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі на неакупіраваных беларускіх землях паводле пастановы Усерасійскай нарады Саветаў на з'ездзе Саветаў Мінскай, Віленскай і Магілёўскай губерняў у чэрвені 1917 г. была ўтворана Заходняя вобласць. Яна стваралася з мэтай цэнтралізаваць кіраўніцтва мясцовымі Саветамі, і лічылася часовым аб'яднаннем губерняў [52, с. 425]. Бальшавікі ўключылі неакупіраваную тэрыторыю Беларусі ў Паўночна-Заходні раён РСДРП(б), які быў створаны рашэннямі І Паўночна-Заходняй канферэнцыі РСДРП(б) (15 – 18 верасня 1917 г.) і ахопліваў арміі Заходняга фронту, Віленскую, Мінскую, Магілёўскую і Віцебскую губерні [148, с. 1]. Гэтая бальшавіцкая арганізацыя па сваім складзе была на 3/4 вайсковай. Падчас падрыхтоўкі Кастрычніцкай рэвалюцыі бальшавікі фронту выйшлі на першыя пазіцыі на Беларусі. Яны ўзначалілі многія Саветы, працавалі ў міліцыі [58, с. 108]. Менавіта бальшавікі Заходняга фронту сталі стваральнікамі Абласнога выканаўчага камітэта Заходняй вобласці і фронту, органа які здзяйсняў функцыі дзяржаўнай улады на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі ў перыяд з 26 лістапада 1917 г. па 3 студзеня 1919 г. У дзейнасці Аблвыкамзаха можна вылучыць 2 перыяды – Мінскі (да 19.02.1918) і Смаленскі (з 13.04.1918.), якія адрозніваюцца паміж сабой не толькі месцам яго прабывання, але паўнатой уладных паўнамоцтваў, структурнымі асаблівасцямі, партыйным складам, асноўнымі накірункамі дзейнасці і задачамі.

Непрацяглы тэрмін існавання Заходняй вобласці з'яўляецца ў гісторыі Беларусі важным і значным момантам – часам узнікнення так званай "альтэрнатыўнай гістарычнай сітуацыі". Суадносіны сіл склаліся такім чынам, што існавала аб'ектыўная магчымасць для двух супрацьлеглых шляхоў развіцця Беларусі: у форме ўласнай дзяржаўнасці ці нацыянальнага рэгіёну Расійскай федэрацыі. Дык чым жа з'яўляўся для Беларусі "Заходне-абласны" перыяд – стадыяй дзяржаваўтварэння ці крокам у зваротным накірунку?

У савецкі перыяд навуковае вывучэнне гістарычных фактаў поўнасцю падпарадкоўвалася ідэалагічным заказам Камуністычнай партыі. Яны, калі не ўкладаліся ва ўстаноўленую схему, альбо замоўчваліся, альбо скажаліся. Таму савецкая гістарычная навука побач са значнымі навуковымі дасягненнямі пакінула малавывучанымі і нераспрацаванымі шэраг важных навуковых праблем. Да адной з такіх адносіцца і дзейнасць Аблвыкамзаха. Савецкія гісторыкі звярталіся да яе пры асвятленні рэвалюцыйных падзей 1917 г., але сам Аблвыкамзах у якасці самастойнага прадмета даследавання ніколі не выступаў. Гэта не гаворыць аб яго недаацэнцы. Наадварот, поўнасцю прызнаваліся заслугі Аблвыкамзаха ў галіне замацавання савецкай улады на Беларусі. Адказ трэба шукаць у іншым аспекце дзейнасці Аблвыкамзаха – у нацыянальнай палітыцы. Ігнараванне ім нацыянальных правоў беларускага народа, актыўнае супрацьдзеянне ўсім спробам будаўніцтва беларускай дзяржаўнасці магло дыскрэдытаваць пастулат "аб няўхільным правядзенні

Камуністычнай партыяй ў жыццё прынцыпаў ленінскай нацыянальнай палітыкі".

Недастатковая вывучанасць праблемы параджала скажонае ўяўленне аб рэчаіснасці, так званыя "гістарычныя міфы". У дачыненні да Аблвыкамзаха можна прывесці некалькі найбольш пашыраных у савецкай гістарыяграфіі міфаў. "Аблвыкамзах быў утвораны воляй працоўнага народа Заходняй вобласці і рэвалюцыйных салдат Заходняга фронту". Гэты міф быў народжаны самім Аблвыкамзахам яшчэ ў 1917 г. з мэтай пераканаць грамадскасць у сваім легітымным паходжанні і правамоцнасці вырашаць пытанні дзяржаўнага, палітычнага, адміністрацыйна-гаспадарчага ўладкавання Беларусі. Зыходзячы з гэтага ён супрацьпастаўляўся Радзе БНР. З боку многіх дзеячаў беларускага нацыянальнага руху гучалі зусім іншыя суджэнні. Сутнасць гэтай пазіцыі наступная: "Савет народных камісараў Заходняй вобласці і фронту здзейсніў злачынны акт і ўзурпіраваў уладу ў краі" [20, с. 11; 76, с. 25; 227, с. 4]. Зразумела, што падобныя заявы не браліся ў разлік савецкімі гісторыкамі, і імі не рабіліся спробы крытычнага асэнсавання працэсу стварэння абласнога органа ўлады ў Заходняй вобласці ў 1917 г., што з поспехам робіцца сёння. Асаблівае значэнне ў развенчванні гэтага міфа маюць працы І.М. Ігнаценкі "Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі" (1995) і С.С. Рудовіча "Час выбару: Праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 годзе" (2000).

Засталося нявырашаным дыскусійнае пытанне аб характары Заходняй вобласці. З прычыны таго, што вобласць стала эканамічнай і палітычнай базай для стварэння Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусь, некаторыя даследчыкі схільны былі прыпісваць ёй нацыянальна-аўтаномны статус. Сцвярджалася, што Заходняя вобласць адрознівалася ад іншых тэрытарыяльных адзінак РСФСР нацыянальным складам насельніцтва і нацыянальна-тэрытарыяльным прынцыпам яе арганізацыі. У гэтым выпадку Аблвыкамзах выступаў органам улады беларускага народа [12, с. 221; 32, с. 44; 69, с. 49; 98, с. 64; 121, с. 38]. Імкненне гісторыкаў надаць Заходняй вобласці статус нацыянальнай аўтаноміі можна растлумачыць перш за ўсё жаданнем паказаць з найлепшага боку палітыку РКП(б) у адносінах да нацыянальных меншасцяў. На той момант, ва ўмовах нямецкай акупацыі, нацыянальная аўтаномія Заходняй вобласці была бы вырашэннем беларускага нацыянальнага пытання, што ў сваю чаргу сведчыла б аб паслядоўным ажыццяўленні камуністамі на Беларусі нацыянальнай ленінскай палітыкі. Трэба адзначыць, што дадзены міф канчаткова не ўкараніўся ў савецкай гістарыяграфіі і падвяргаўся крытыцы з боку некаторых даследчыкаў яшчэ ў савецкія часы, якія называлі Заходнюю вобласць, нягледзячы на тое, што яна аб'ядноўвала ў сваіх межах беларускія землі і мела характар нацыянальнага раёна, звычайнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкай [94, с. 48; 229, с. 44].

Недастатковае асвятленне ў айчыннай гістарыяграфіі атрымаў Смаленскі перыяд дзейнасці Аблвыкамзаха. Акупацыя большай часткі Беларусі, барацьба за нацыянальнае самавызначэнне прадвызначылі асноўны акцэнт большай часткі навуковых даследаванняў. Найбольш папулярнымі былі праблемы

вызвалення беларускіх зямель з-пад нямецкай акупацыі, партызанскай барацьбы, пабудовы беларускай дзяржаўнасці. Менавіта ў такім ключы падаецца дзейнасць Аблвыкамзаха і Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РКП(б). Засталіся па-за ўвагай, ці вельмі павярхоўна закранаюцца многія важныя праблемы, звязаныя з жыццём вобласці ў азначаны перыяд: палітыка цэнтралізацыі, якую Аблвыкамзах праводзіў у яе межах, барацьба за захаванне вобласці, пытанні адміністрацыйнага, гаспадарчага і культурнага кіраўніцтва ёю і г.д.

Такім чынам, недастатковая даследаванасць дадзенай праблемы пакідае шэраг нявырашаных прынцыповых пытанняў, якія патрабуюць больш грунтоўнага і ўсебаковага навуковага вывучэння.

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Актуальнасць тэмы дысертацыі.** Гісторыя Кастрычніцкай рэвалюцыі для гістарычнай навукі традыцыйна з'яўлялася адным з прыярытэтных напрамкаў даследавання. Працэс станаўлення і функцыянавання мясцовых савецкіх органаў улады на Беларусі не абыдзены ўвагай у айчыннай гістарыяграфіі і разглядаецца ў шэрагу навуковых прац. Але адсутнічае комплекснае даследаванне, у якім бы аналізаваліся стварэнне і дзейнасць абласнога савецкага цэнтра Заходняй вобласці. Гэта перашкаджае цэласнаму ўспрыняццю працэсаў і з'яў, якія адбываліся падчас закладання падмурка беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці, што ў сваю чаргу не дае рэальных уяўленняў на гэты конт. Такім чынам, з прычыны недастатковага ўзроўню распрацаванасці, тэма дысертацыйнай работы з'яўляецца важнай і актуальнай.

**Сувязь работы з навуковымі праграмамі, тэмамі.** Дысертацыя з'яўляецца часткай дзяржаўнай праграмы фундаментальных даследаванняў "Гісторыя і культура" і выканана ў рамках тэмы "Фарміраванне дзяржаўных граніц Беларусі (1918-1921 гг.)", якая распрацоўваецца кафедрай гісторыі Беларусі новага і навейшага часу Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

**Мэта і задачы даследавання.** Мэтай дысертацыйнага даследавання з'яўляецца: раскрыць на аснове разнастайнага кола гістарычных крыніц спецыфіку фарміравання і функцыянавання Заходне-абласнога савецкага цэнтра як органа дзяржаўнай улады ў розныя перыяды яго існавання. Мэта абумовіла наступныя задачы:

1. Устанавіць прычыны, перадумовы і вынікі стварэння Абласнога выканаўчага камітэта Заходняй вобласці і фронту, паказаць працэс рэстаўрацыі гэтага органа ўлады ў новых гістарычных умовах.
2. Даследаваць структуру і прынцыпы арганізацыі Аблвыкамзаха.
3. Прааналізаваць асноўныя накірункі яго дзейнасці, выявіць тактыку, метады і шляхі правядзення бальшавікамі Заходняй вобласці і фронту першых сацыялістычных пераўтварэнняў.
4. Вызначыць прынцыпы ажыццяўлення Аблвыкамзахам нацыянальнай палітыкі ў межах Заходняй вобласці, адлюстраваць яго ўзаемаадносіны з беларускімі нацыянальнымі арганізацыямі.

**Аб'ект і прадмет даследавання.** Аб'ектам даследавання дадзенай дысертацыйнай працы з'яўляецца сістэма мясцовых і цэнтральных органаў савецкай улады, прадметам – гісторыя стварэння, структурныя адметнасці і функцыянаванне Абласнога выканаўчага камітэта Заходняй вобласці.

**Метадалогія і метады даследавання.** Метадалогія дадзенага навуковага даследавання заснавана на прынцыпах гістарычнага пазнання: гістарызму і аб'ектыўнасці. Згодна прынцыпу гістарызму Аблвыкамзах як гістарычная з'ява вывучаецца ў генезісе і развіцці. Прынцып аб'ектыўнасці патрабуе усебаковага вывучэння прадмета даследавання – Аблвыкамзаха: яго стварэння, прынцыпаў арганізацыі, дзейнасці, з улікам розных пунктаў погляду па праблеме. Галоўнымі метадамі даследавання акрамя агульнанавуковых, з'яўляюцца і

ўласна гістарычныя: гісторыка-параўнальны (параўнанне асаблівасцей арганізацыі, накірункаў дзейнасці Аблвыкамзаха ў розных палітычных умовах), рэтраспектыўны (выяўленне зыходных прычын, абумовіўшых адметнасці функцыянавання Аблвыкамзаха) і гісторыка-генетычны (Аблвыкамзах вывучаецца з моманту ўзнікнення, у працэсе развіцця да канца свайго існавання).

**Навуковая навізна і практычная значнасць атрыманых вынікаў.** У дысертацыі ўпершыню ў айчыннай гістарыяграфіі прадпрынята спецыяльная спроба комплексна і ўсебакова прааналізаваць працэс стварэння, функцыянаванне і асноўныя аспекты дзейнасці Аблвыкамзаха, які вылучаны ў самастойны прадмет даследавання. Аўтарам упершыню аналізуюцца ўмовы, у якіх апынуўся Аблвыкамзах пасля пераезду ў Смаленск; разглядаюцца захады кіраўніцтва вобласці па яе захаванню. Выяўлена ступень уздзеяння абласнога партыйнага камітэта на Аблвыкамзах. Вывучана дзейнасць Аблвыкамзаха па адміністрацыйнаму, сацыяльна-эканамічнаму ўпраўленню вобласцю. Раскрываецца сутнасць палітыкі цэнтралізацыі, якую Аблвыкамзах праводзіў у межах Заходняй вобласці; паказваецца барацьба за ўладу паміж ім і губернскімі выканаўчымі камітэтамі.

З улікам новых фактаў і падыходаў раскрываюцца прычыны і матывы стварэння Аблвыкамзаха, вызначаецца месца і значэнне Заходне-абласнога перыяду ў гісторыі Беларусі.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Вынікі дысертацыйнай работы могуць выкарыстоўвацца навуковымі супрацоўнікамі, аспірантамі, выкладчыкамі і студэнтамі пры вывучэнні гісторыі Беларусі, праблем станаўлення беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону.**

1. Спецыфіку пабудовы абласной савецкай улады ў заходнім рэгіёне Расіі ў лістападзе 1917 г. абумовіла геапалітычнае становішча Беларусі, з гэтай нагоды ёй адводзілася важная роля ў стратэгічных планах бальшавікоў. Паколькі асноўнай іх апорай на Беларусі з'яўляліся вайскоўцы, вобласць была аб'яднана пад адзіным кіраўніцтвам з фронтам. Гэтае ўтварэнне на той момант не мела аналагаў і было заклікана забяспечыць бальшавікам дамінаванне ў дадзеным рэгіёне.
2. З'езды Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў Заходняй вобласці, сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў і II з'езд армій Заходняга фронту, праведзеныя Паўночна-Заходнім абласным камітэтам у лістападзе 1917 г. сталі спосабам замацавання ўлады бальшавікоў на тэрыторыі Беларусі. Але лакальны і класавы характар абмежаванняў дэлегацкага прынцыпу ўсіх трох з'ездаў, перавага на іх вайсковага элемента, сведчаць аб беспадстаўнасці прэтэнзій Аблвыкамзаха на статус паўнамоцнага прадстаўнічага органа беларускага народа.
3. Стварэнне і захаванне ў неспрыяльных гістарычных умовах яднаючага палітычнага цэнтра беларускіх зямель – Аблвыкамзаха – мае выключна

важнае значэнне для станаўлення нацыянальнай беларускай дзяржаўнасці. З улікам таго, што Заходняя вобласць стала эканамічнай і палітычнай асновай ССРБ, гістарычны факт яе існавання можна аднесці да пераходнага этапу беларускага дзяржаваўтварэння.

4. Ідэі пралетарскага інтэрнацыяналізму пусцілі глыбокія карані ў свядомасці многіх вядучых партыйных і савецкіх кіраўнікоў Заходняй вобласці і сталі прычынай недаацэнкі імі важнасці і значнасці нацыянальнага пытання на Беларусі. Востры канфлікт кіраўніцтва вобласці і прадстаўнікоў беларускіх нацыянальных арганізацый абумоўлены як імкненнем першых захаваць усю паўнату ўлады ў рэгіёне, так і іх уласным бачаннем перспектыў развіцця сусветнай рэвалюцыі.
5. Замена дарэвалюцыйнага апарата ўпраўлення Саветамі суправаджалася паўсюдным аслабленнем сувязяў паміж рознымі рэгіёнамі Расіі. З вясны 1918 г. савецкі ўрад узяў курс на цэнтралізацыю краіны. Абласны выканаўчы камітэт Заходняй вобласці прапанаваў сваю мадэль дзяржавы: будучая Расійская рэспубліка ўяўлялася яму аб'яднаннем моцных цэнтралізаваных абласцей, якія аднак няўхільна праводзілі б усе распараджэнні цэнтральнай улады. Намаганні Аблвыкамзаха былі накіраваны на пераўтварэнне Заходняй вобласці, сабранай з рэшткаў акупіраваных губерняў, у адзіны гаспадарчы і палітычны арганізм.
6. Вядучыя пазіцыі ў кіраўніцтве Заходняй вобласці займалі прадстаўнікі правячай партыі бальшавікоў. Разрыў з левымі эсэрамі стаў галоўным крокам для Аблвыкамзаха ў бок манапартыйнасці і перадумовай для манапалізацыі партыяй бальшавікоў права на рэалізацыю дзяржаўнай улады. Гэты працэс актывізаваўся і паскорыўся з лета 1918 г.

**Асабісты ўклад суіскальніка.** Дысертацыйнае даследаванне праведзена аўтарам самастойна, галоўныя палажэнні дысертацыі сфармуляваны на аснове асабістых вывадаў. Аўтарам былі выкарыстаны шэраг дакументаў, упершыню уведзеных у навуковы зварот.

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі.** Асноўныя палажэнні і вывады дысертацыі апублікаваны ў 9 навуковых артыкулах. З іх 5 – надрукаваны ў навуковых часопісах, што адпавядаюць патрабаванням ВАК Рэспублікі Беларусь, 4 – у матэрыялах канферэнцый. Агульны аб'ём публікацый складае 39 старонак.

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Кандыдацкая дысертацыя па тэме "Абласны выканаўчы камітэт Заходняй вобласці: стварэнне, структура, дзейнасць" складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, трох глаў, заключэння і спіса выкарыстаных крыніц, якія ўключае 235 адзінак. Поўны аб'ём дысертацыі займае 113 старонак.